**Гурская А.С. (Мінск)**

# Максім Багдановіч і Анатоль Сыс: дыялог эпох і пакаленняў

Суаднясенне мастацкага вопыту паэта-сучасніка з традыцыяй класіка – справа не такая простая, як гэта можа паказацца на першы погляд. Здавалася б, веданне таго, што М. Багдановіч быў літаратурным кумірам А. Сыса, што творчасць абодвух жывілася нацыянальнай ідэяй, што ім быў адпушчаны кароткі, поўны драматызму век, павінна лёгка вывесці на пункты судакранання, на выяўленне тыпалагічных сыходжанняў, ідэйна-вобразнай пераемнасці і наследавання. Аднак зместавы і стылёвы «зрэз» паэтычных тэкстаў не дазваляе рабіць такія адназначныя высновы, прычынай чаму – непаўторнасць, выключная асабовасць творцаў. Дадзеная агаворка, разам з тым, ніяк не здымае пытання пра духоўную прысутнасць аўтара «Вянка» ў паэзіі (ды і ў рэальным жыцці) А. Сыса.

«Багдановіч, Купала і Караткевіч – вось «Тройца», на якую ён моліцца!» [3, с. 6], – з упэўненасцю сцвярджае аўтар кнігі «Сыс і кулуары» Л. Галубовіч. Калега па пяры, ведаючы паэта зблізку, мог меркаваць пра яго творчыя і жыццёвыя прыхільнасці не толькі на аснове публічных абвяшчэнняў, якіх у А. Сыса было нямала. За шматразовымі атэстацыямі сябе як «сына Купалы» і «брата Багдановіча» стаяла, пэўна ж, штосьці большае, чым звычайная бравада ці прага самаўзвелічэння. Сталася ж так, што сказанымі ці то жартам, ці то ўсур'ёз словамі А. Сыс нібыта запраграмаваў сваё месца побач з самымі слыннымі айчыннымі творцамі, заснавальнікамі паэтычных традыцый, якімі жыла нацыянальная літаратура на працягу ўсяго XX ст.

«Тройцу» аўтараў (толькі ў іншым складзе), якія зрабілі найбольшы ўнёсак у станаўленне і развіццё беларускай вербальнай культуры, у свой час вылучаў М. Стральцоў: «Купала, Колас і Багдановіч – гэта паэтычны трохкутнік, кожная з вяршынь якога паказвае ў будучыню і кідае праекцыю на яе. Гэта тры вымярэнні, на якіх пабудаваны свет нашай літаратуры. Гэта аснова асноў і пачатак усіх пачаткаў» [6, с. 458]. Гарачы, імпульсіўны, парывісты Купала быў «голасам, сумленнем <...> вачамі і розумам» [6, с. 450] беларусаў. Падобна Прароку, свой прыгнечаны занядбаны народ ён «зваў з путаў на свабоду, / Зваў з цемры да святла» [4, с. 360], далёка не заўсёды знаходзячы адпаведны водгук у тых, да каго звяртаўся з палымяным словам. Купала быў з народа і з народам, таму натуральна, свабодна, шырока ўвайшло ў яго творчасць тое, што па вызначэнні М. Багдановіча з'яўляецца «народным духам», што абумовіла шматграннасць яго творчай асобы. Маладзейшага за Купалу і Коласа аўтара «Вянка» М. Стральцоў назваў «апошнім дыяментам, якога толькі не ставала, каб належным чынам упрыгожыць нашу паэтычную карону» [6, с. 455]. М. Багдановіч вылучаецца ў «нашаніўскім» літаратурным кантэксце найперш сваёй свядомай скіраванасцю на класічныя традыцыі, нястомнай працай на «пашырэнне кола тэм і форм беларускай паэзіі» [2, с. 281], на засваенне «таго, што соткі народаў праз тысячы год сабіралі ў скарбніцу светавой культуры» [2, с. 291]. Звернуты да самых розных традыцый, напрамкаў і відаў паэтычнай дзейнасці, далёкіх ці больш блізкіх літаратур і эпох, паэт, разам з тым, здзіўляе не толькі сваёй анталагічнасцю, энцыклапедызмам, але і гарманічнасцю, «цэласнасцю і маналітнасцю» (В. Івашын) уласнага мастацкага свету.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Зразумела, гаварыць пра нейкага творцу як «пра пачатак пачаткаў» напрыканцы стагоддзя не выпадае. Аднак ёсць пачатак (шляху, традыцыі, тэндэнцыі), ёсць працяг і завяршэнне, за чым пачынаецца штосьці новае. І. Штэйнер выказаў нечаканую і ў той жа час слушную думку, што творчасць А. Сыса «з’яўляецца іерогліфам, сімвалам пошукаў айчыннай паэзіі XX стагоддзя і яе асаблівым вынікам, бо ўжо ў традыцыйным выглядзе існаваць разам не будзе ці будзе зусім ня доўга» [8, с. 7].

Даследчыкі ў свой час неаднойчы адзначалі праблемнае, тэматычнае, стылёва-вобразнае перагукванне паэзіі другой паловы 1980 – 1990-х гг. з «нашаніўскай», якое было ў многім абумоўлена блізкасцю сацыякультурнай сітуацыі на пачатку і ў канцы мінулага стагоддзя. У грамадскую і літаратурную свядомасць вярталіся многія з пастаўленых некалі, але так і нявырашаных (ці вырашаных няпоўнасцю) пытанняў, галоўнымі сярод якіх былі адраджэнне нацыянальнай свядомасці, захаванне гістарычнай памяці, паважлівае стаўленне да роднай мовы і культурнай спадчыны.

«Слухайце час!» – гаварыў глыбокашанаваны А. Сысам «нашанівец» М. Багдановіч, адгукаючыся на зменлівыя, часта драматычныя падзеі сучаснага яму жыцця. Паэтычны нашчадак аўтара «Вянка» слухаў *свой* час – 1980-я – пачатак 1990-х гг. – час, калі імкліва ўзняўся ўзровень грамадскай актыўнасці, вырасла нацыянальная самасвядомасць, стала запатрабаваным публічна сказанае слова. Маладыя паэты пакалення «Тутэйшых», да якога належаў і А. Сыс, былі заангажаваны беларушчынай, як калісьці Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, В. Ластоўскі, А. Гарун і інш. Час заўсёды выбірае нераўнадушных, неабыякавых да лёсу Радзімы і будучыні народа – прарокаў, песняроў, сейбітаў разумнага, добрага, вечнага.

Эстэтычнае крэда, сфармуляванае ў першай кнізе А. Сыса «Агмень» (1988), сведчыць пра ўсведамленне паэтам адказнасці, якой патрабуе абраная ў якасці прыярытэтнай вечная, «сакральная» тэма Бацькаўшчыны. У вершы-зачыне «– З чаго пачаць?.. Пачну з Радзімы...», пабудаваным ў форме дыялогу лірычнага героя і яго «апанента» – унутранага іранічнага голасу паэта, А. Сыс акрэсліў крытэрыі, якім, на яго погляд, павінна адпавядаць мастацкае слова, каб не быць зацяганым, рытарычным, прахадным, асабліва тады, калі яно дакранаецца да такой святыні, як Радзіма. Служэнне паэзіі, патрабуючы надзвычайнага душэўнага выдаткавання ў прынцыпе (невыпадкова на яе алтары «згарэлі» многія выдатныя творцы розных часоў і народаў, сярод якіх і шэраг пісьменнікаў-«нашаніўцаў»), ва ўмовах «тутэйшай» рэальнасці здаўна мела дарагі кошт – даводзілася выбіраць не проста род дзейнасці, а Беларусь, беларускую мову. А. Сыс, свядома ўзышоўшы на «поле бою», дзе «не адзін паэт сканаў» [7, с. 13], выбраў «долю» служыць Беларусі і застаўся на гэтым шляху да канца, спазнаўшы ў выніку і тую «нядолю», якую прадказваў празорлівы «субяседнік» лірычнага героя.

Мастацкая рэалізацыя тэмы Радзімы ў творчасці А. Сыса рознілася ад пашыранага ў паэзіі савецкага перыяду яе ўвасаблення, калі вобраз роднага краю паўставаў ідэалізаваным, прыхарошаным (шчаслівая краіна са шчаслівымі людзьмі), і набліжалася да яе трактоўкі паэтамі «нашаніўскай» пары. У іх – побач з верай у лепшую будучыню народа («Беларусь, твой народ дачакаецца /

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Залацістага, яснага дня» [1, с. 440]) гучыць боль ад усведамлення драматызму яго гістарычнага шляху («Знікла ўсё, як імгла, / Няма славы тваей; / Злая доля змагла / І мой край, і людзей!» [4, с. 59]). Па меры сталення таленту А. Сыса матыў Радзімы ў яго творах набыў адценні акрэсленага гістарызму, філасофскага абагульнення («Колькі нашай любові / не спазнала Радзіма?.. / Колькі вояў-сыноў / не счакала радзіна?..» [7, с. 37]), што выразна прысутнічае ў творчасці працытаваных вышэй М. Багдановіча, Я. Купалы, а таксама А. Гаруна, В. Ластоўскага.

Паэтычны шлях да Радзімы нашага сучасніка, як і яго папярэднікаў, пралягаў праз поле мовы, якое ён, падобна дбайнаму аратаму, абрабляў нястомна і самааддана. Народжанае ў негалодны час, пакаленне А. Сыса адчувала голад духоўны, вымушана было «жабраваць» роднае слова на ўласнай зямлі: «Так скажу: / ару я мову. / І бывае, ў непагоду / стынуць вусны, мёрзнуць словы, / я з хатолкай – год галодны» [7, с. 21]. Наталіць прагу «бязмоўнасці» можа толькі мова прашчураў, якая ў вершаваным радку А. Сыса асацыіруецца з пашыраным у вусна-паэтычнай творчасці вобразам жывой вады. «Збірае» яе лірычны герой «ад хутара да вёскі» – там, дзе звініць непаўторнае палескае «о», дзе «вырай <...> радзіму кліча: Кры-чаў, Кры-чаў...» [7, с. 22].

Метафарычны вобраз жывой вады (крыніцы) даволі часта сустракаецца ў творах М. Багдановіча – «Даўно ўжо целам я хварэю...», «Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...»), «Санет» («Замёрзла ноччу шпаркая крыніца...») – і іншых пісьменнікаў «нашаніўскай» плеяды. Аднак семантычнае напаўненне вобраза ў іх звязана з грамадскімі запатрабаваннямі пачатку мінулага стагоддзя. *Жывая вада* і яе сінонім *крыніца* ўвасабляе ў дадзеным выпадку рух, сілу дзеля абнаўлення, дзеля перамогі над неспрыяльнымі абставінамі, дзеля адраджэння краю, народа: «Замёрзла ноччу шпаркая крыніца; / Твая пара, зімовая нуда! / Цяпер няма ўжо руху ні следа, / І нават зверху слоем снег лажыцца. / Ды ўсё дармо, бо там, пад ім, струіцца / Магутная, жывучая вада. / Чакай! Яе йшчэ прыдзе чарада! / Здалее хваляў хор на вольны свет прабіцца» [1, с. 248] .

Варта падкрэсліць, што фальклорна-міфалагічная метафарызацыя ў мастацкіх тэкстах сучаснага паэта выяўляецца ў розных плоскасцях і ракурсах: у назвах першых дзвюх кніг і шматлікіх вершаў, у паэтызацыі язычніцкай абраднасці, у стварэнні вобразаў міфалагічных персанажаў, у звароце да эсхаталагічных матываў, у апрабацыі жанраў народна-песеннай лірыкі, у выкарыстанні рытмічнага ладу фальклорнай першакрыніцы. У ліку самых заўважных набыткаў А. Сыса, па словах І. Штэйнера, – вяртанне ім у беларускую культуру «традыцыі міфалагічнага ўспрымання свету, страчанага не толькі намі, але і ўсімі славянамі...» [8, с. 7]. Названая традыцыя, нагадаем, з'яўлялася адной з самых плённых у беларускай літаратуры пачатку XX ст. Як гэта ні парадаксальна, яна дапамагала творцам і мастацтву слова ў цэлым адшукаць адметныя формы, вобразна-стылёвыя аспекты ўвасаблення рэчаіснасці, не згубіцца сярод многіх іншых.

Актуальныя для пісьменнікаў-«нашаніўцаў» праблемы *мастак і народ, паэт і паэзія* аказаліся запатрабаванымі і ў канцы XX ст., хоць пытанне для каго ўздымаць «скібіну слова» (Я. Купала), пэўна ж, даўно вырашана. Дзякуючы М. Багдановічу быў адшуканы, здаецца, парытэт паміж матэрыяльным і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

духоўным, утылітарным і эстэтычным – паміж каласамі і васількамі. А. Сыс, трэба адзначыць, у дадзеным выпадку ўступае ў палеміку з аўтарам «Апокрыфа» – твора, які найбольш скандэнсавана выяўляе разуменне М. Багдановічам месца прыгожага ў жыцці і літаратуры («...Нашто каласы, калі няма васількоў?» [2, с. 52]). У вершы «Якое б жыта ні ўрадзіла...» сучасны паэт звярнуўся, па сутнасці, да тых жа вобразаў, што і яго папярэднік: «А калі доля быць паэтам, / дык мерай спраў маіх ці слоў / мне будзе не цнатлівасць кветак, / а важкасць спелых каласоў» [7, с. 39]. Супрацьпастаўленне каласоў і кветак у А. Сыса мае іншую семантыку, якая больш выразна раскрываецца ў вершы «Паэт» і звязана з рэаліямі канца XX ст.: «Паэт не мае права быць паэтам / цнатлівае і чыстае красы, / калі ў Айчызне загніваюць рэкі / і засыхаюць на вачох лясы» [7, с. 185].

Рэзкае непрыманне пісьменнікам «чыстай красы» тлумачыцца, на наш погляд, не толькі яго актыўнай жыццёвай пазіцыяй, але і замацаваным у свядомасці многіх людзей уяўленнем пра грамадзянскую місію творцы (успомнім хоць бы хрэстаматыйныя радкі М. Някрасава: «Поэтом можешь ты не быть, / Но гражданином быть обязан») і ў сувязі з гэтым далёкім ад сапраўднага разумення поглядаў аўтара «Вянка» на ролю мастака і мастацтва ў жыцці народа. Не будзем забываць, што ў «апалагета «чыстай красы» (якая нібыта адарвана ад усякіх жыццёвых праблем – агульнаграмадскіх і індывідуальна-асабістых) балела душа за сацыяльную і нацыянальную неабароненасць народа, за тысячы нявінных ахвяр Першай сусветнай вайны, за раз’яднанасць і варожасць паміж людзьмі, якія «разам ляцяць да зор». Звернемся ў гэтай сувязі да выказвання А. Луцкевіча, дзякуючы якому за М. Багдановічам трывала замацавалася характарыстыка – «песняр чыстай красы». У публічнай лекцыі, прачытанай у 1929 г., вядомы «нашаніўскі» крытык нагадаў сваё колішняе вызначэнне галоўнай асаблівасці Багдановіча-паэта і ўдакладніў яго: «Грамадскія матывы, заклікі, ідэалы могуць складаць ЗМЕСТ мастацкага творства, могуць служыць магутным ПАБУДЖЭННЕМ да тварэння, але *не могуць дыктаваць сваіх законаў КРАСЕ*» [5, с. 24]. Законам КРАСЫ, такім чынам, павінны падпарадкоўвацца творы самай рознай тэматыкі і пафасу.

На ўсіх этапах існавання літаратуры актуальнай застаецца праблема абнаўлення яе зместу і формы. І калі змест вельмі часта «падказвае» жыццё, то форма звычайна звязана з пошукамі, эксперыментаваннем саміх творцаў. Так, М. Багдановіч шмат зрабіў на шляху «засваення «тэхнічнага арсенала» сусветнай паэзіі» [9, с. 212], значна ўзбагаціў нацыянальную сістэму вершаскладання. Праведзены вядомым даследчыкам І. Ралько рознабаковы статыстычны аналіз метрыкі М. Багдановіча выявіў надзвычайнае багацце вершаваных памераў, страфічных форм, якімі карыстаўся мастак слова. У дачыненні да паэзіі А. Сыса падобныя падлікі пакуль не праводзіліся. Аднак відавочна, што ён, будучы прыхільнікам класічнай мастацкай традыцыі (гэта выявілася ў адраджэнскім пафасе творчасці, у выкарыстанні архетыпаў нацыянальнага свету, у сугестыўнасці выказвання, інш.), засведчыў, што традыцыі жывуць не ў «чыстым», «знятым» выглядзе, а ў развіцці, што наследаванне ім не выключае ўласнага актыўнага пошуку. Назіранні над мастацкімі асаблівасцямі паэзіі А. Сыса дазваляюць гаварыць пра

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шматвектарнасць жанрава-стылёвых рашэнняў, рытміка-інтанацыйную гнуткасць, вобразную шматзначнасць і экспрэсію, разнастайнасць і багацце строфікі.

Творчасць А. Сыса, аднаго з самых яркіх прадстаўнікоў беларускай паэзіі канца ХХ ст., нават у такім, па сутнасці, рэфератыўным яе разглядзе, сведчыць пра дзейснасць у сучасным літаратурным працэсе духоўна-эстэтычных традыцый, закладзеных славутай кагортай пісьменнікаў-адраджэнцаў «нашаніўскай» пары.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992 – 1995. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі, чарнавыя накіды. – 1993.
3. Галубовіч, Л.М. Сыс і кулуары : літаратурна-крытычныя эсэ / Л.М. Галубовіч. – Мінск, 2010.
4. Купала, Я. Вершы. Паэмы. П’есы / Я. Купала ; прадм. У. Гніламёдава. – Мінск, 2007.
5. Луцкевіч, А. Праблемы красы й мастацтва ў творах Максіма Багдановіча / А. Луцкевіч // Максім Багдановіч: вядомы і невядомы : зб. літаратуразн. і арх. матэрыялаў ; уклад. і камент. Ц.В. Чарнякевіча ; прадм. і гласарый Ю.В. Пацюпы. – Мінск, 2011. – С.16–24.
6. Стральцоў, М. Выбранае : проза, паэзія, эсэ / М. Стральцоў. – Мінск, 1987.
7. Сыс, А. Лён : выбраныя творы / А. Сыс. – Мінск, 2006.
8. Штэйнер, І. «Свае руны мне не вышыць…»: спадчына Анатоля Сыса / І. Штэйнер. – Мінск, 2008.
9. Яскевіч, А. Нашаніўскае Адраджэнне: станаўленне класічнага нацыянальнага стылю / А. Яскевіч // Янка Купала і Якуб Колас і дзяржаўна-культурнае будаўніцтва. – Мінск, 2007. – С. 193–222.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ